# Літаратурна-музычная гасцёўня «Застаўся ў нашым сэрцы», прысвечаная жыццю і творчасці М.Багдановіча

**Ж. А. Бобрык**,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
гімназіі № 1 г. Валожына

*На працягу мерапрыемства фонам гучыць беларуская народная музыка.*

**1-я дзяўч.** Вось валошкі, рамонкі, уюнок,
Ціха крочу сцяжынкаю вузкай.
Для цябе я збіраю вянок
З сціплых кветак зямлі беларускай.

**2-я дзяўч.** Я зрываю і ружы,і мак,
І, напэўна, зрываю не першай
Для цябе, беларускі юнак,
За твае незабыўныя вершы.

**3-я дзяўч.** Мне балюча і горка зусім,
Што зрабіць мне, каб кветкі не звялі?
Ты прымі гэты сціплы вянок
Ад сучасных мадон, ад землячак.

**1-я дзяўч.** Я не ўсё, што хацела, сказала,
У нашых сэрцах жывеш ты, павер.
І любові, што меў гэтак мала,
У цябе вельмі многа цяпер.

**2-я дзяўч.** І твае чарадзейныя словы
Даказалі даўно ўсяму свету,

Як пяшчотна гучыць наша мова

У сапраўдных вялікіх паэтаў.

**3-я дзяўч**. Беларусы табой ганарацца,

Тут імя тваё дорага ўсім,

І так хораша нам называцца

Землякамі тваімі, Максім.

**Вядучы.** Добры дзень, паважаныя сябры. Сёння мы сустракаемся ў літаратурнай гасцеўне ў фармаце «Печа-куча»[1], якая прысвечана вялікаму песняру Беларусі, паэту, празаіку, перакладчыку, крытыку, публіцысту, стваральніку беларускай літаратуры і літаратурнай мовы новага часу, вялікаму грамадзяніну і патрыёту Радзімы, які ўсё сваё кароткае жыццё аддаў служэнню свайму народу, – Максіму Багдановічу.

9 снежня 1891 года ў Мінску ў сям’і настаўнікаў нарадзіўся чалавек надзвычайнага таленту і незвычайнага лёсу. Таленту яму было дадзена ад прыроды столькі, што ён мог бы выкрасаць чарадзейны агонь паэзіі яшчэ і сёння. Але лёс яму выпаў больш чым жорсткі: ён згарэў ад сухотаў на дваццаць шостым годзе жыцця.

❒ ***<u>Прэзентацыя «Бацькі М.Багдановіча</u>»*** (*выступленне вучня).*

Бацькі паэта былі інтэлегентнымі высокаадукаванымі людзьмі. Бацька паэта, Адам Ягоравіч, скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, працаваў выкладчыкам і кіраўніком гарадскога пачатковага вучылішча ў Мінску. Ён шмат займаўся самаадукацыяй, самастойна вывучыў некалькі замежных моў, добра ведаў беларускі фальклор, апублікаваў некалькі навуковых прац этнаграфічнага і гістарычнага характару, выступаў і як публіцыст.

Маці, Марыя Апанасаўна Мякота, (1869-1896) скончыла Мінскае трохкласнае жаночае вучылішча, потым – Санкт-Пецярбургскую земскую настаўніцкую школу, добра ведала літаратуру, займалася педагагічнай практыкай. Яна шмат чытала, любіла мастацтва, мела літаратурныя схільнасці і надзвычай

[1]Фармат «Печа-куча» — гэта прадстаўленне кароткіх дакладаў, спецыяльна абмежаваных па форме і працягласці. Яна ўяўляе сабой невялікую прэзентацыю, якая суправаджаецца 20 слайдамі, на кожны з якіх адводзіцца 20 секунд.

жывую фантазію, па натуры была мяккай, весёлай, вельмі ўражлівай, эмацыянальнай.

У Адама Ягоравіча і Марыі Апанасаўны было чацвёра дзяцей (сыны Вадзім, Максім, Леў, дачка Ніна). Усебаковаму развіццю дзяцей, і Максіма ў тым ліку, спрыялі іх прага да ведаў і высокая адукаванасць бацькоў.

У 1892 г., праз некалькі месяцаў пасля нараджэння Максіма, Адам Ягоравіч вымушаны быў пакінуць пасаду выкладчыка ў сувязі з пагаршэннем стану здароўя і стаць банкаўскім служачым, прычым яму прыйшлося змяніць нават месца жыхарства.

**Вядучы.** Летам 1892 года сям'я Багдановічаў пераязджае ў Гародню, дзе і прайшло дзяцінства паэта.

***❒ Віртуальны музей «Жыццё Максіма Багдановіча ў Гародні»*** *(прэзентацыя падрыхтавана вучнем)*

У сям'і, у якой гадаваўся Максім Багдановіч, шмат увагі надавалася выхаванню дзяцей. Бацька абуджаў у іх цікавасць да прыроды, жыцця і культуры народа, прывіваў любоў да літаратуры (трэба адзначыць, што ў сям'і Багдановічаў размаўлялі па-руску).

У 1894 г. у Гародні нарадзіўся малодшы брат Максіма – Леў. Марыя Апанасаўна займалася хатнімі справамі, гадавала дзяцей. У 1895 г. маці з дзецьмі некалькі месяцаў жыла ў сваёй старэйшай сястры Стэфаніі ў вёсцы Вяззе (цяпер у Асіповіцкім раёне Магілёўскай вобласці), дзе малыя шмат часу праводзілі на прыродзе, знаёміліся з вясковым жыццём. Там яны пачулі жывую беларускую мову.

Але неўзабаве прыйшло гора. У кастрычніку 1896 г. роды (у сям'і нарадзілася дачка Ніна) справакавалі ў Марыі Апанасаўны туберкулёз і яна памерла. Пяцігадовы Максім вельмі цяжка перанёс яе смерць. «У тую сумную раніцу Максім, які не чакаў блізкай развязкі ў хваробе маці, быў неяк асабліва шумны і вясёлы… Баючыся занепакоіць пры смерці Марыю Апанасаўну, бацька спыніў хлопчыка, які раздурэўся, і пасадзіў у суседнім пакоі на крэсла, загадаўшы сядзець яму ціха. І вось дзіця, якое па твары бацькі здагадалася, што насоўваецца гора,

неяк самотна панікла, як бы асунулася» *(цытата зачытваецца)*. Бацька адзначаў, што па складзе свайго характару, Максім быў «маленькім падабенствам маці». «И вот, как теперь, вижу склонённую фигурку с печальным выражением детского лица, с вопросительным взглядом… Маленькое подобие матери… Он всё время послушно сидел на стуле. И даже смерть матери не видел…» У далейшым інтэлектуальная спадчыннасць: трапнасць назіранняў і іх паўната, сіла ўяўлення, пластычнасць і вобразнасць мыслення – ў поўнай меры праявіліся ў жыцці і творчасці Максіма.

**Вядучы:** Пасля смерці маці ў 1896 г. сям'я пераязджае ў Ніжні Ноўгарад.

***❒ Прэзентацыя «Жыццё ў Ніжнім Ноўгарадзе»*** *(выступленне падрыхтавана вучнем)*

У гэты ж час памерла і маленькая сястрычка Максіма Ніна. Вадзіма, Максіма і Льва даглядалі родныя сёстры Адама Ягоравіча Марыя і Магдалена.

Аб жыцці ў горадзе ў хлопчыкаў засталіся радасныя ўспаміны. Каля 12 гадоў сям'я жыла побач з Максімам Горкім, які быў сябрам бацькі. З дзіцячых гадоў назаўсёды захаваў Максім любоў да Горкага і яго творчасці.

Праз некалькі гадоў пасля смерці Марыі Апанасаўны Адам Ягоравіч ажаніўся з Аляксандрай Паўлаўнай Волжынай (роднай сястрой жонкі Максіма Горкага), аднак яна памерла пры родах, а іх маленькі сын Аляксандр гадаваўся ў сям'і Горкага (у двухгадовым узросце хлопчык цяжка захварэў і памёр).

Пазней А. Я. Багдановіч звязаў сваё жыццё з сястрой сваёй першай жонкі – Аляксандрай Апанасаўнай Мякотай, і ў іх нарадзілася пяцёра сыноў (Павел, Мікалай, Аляксей, Вячаслаў і Раман). З цёткай у Максіма, на жаль, не склаліся добрыя адносіны, што ў далейшым у пэўнай меры адбілася на яго лёсе: уся яе ўвага (і, як следства, клопаты бацькі) была накіравана галоўным чынам на малодшых дзяцей.

У 1902 г. Максім паступае ў першы клас Ніжненаўгародскай мужчынскай гімназіі. Хлопчык адрозніваўся удумлівасцю, сціпласцю, не па гадах сур'ёзнасцю. У гэты час ён піша свае першыя вершы на беларускай мове.

**Вядучы.** У 1908 г. бацька пераязджае па службе ў Яраслаўль. Тут Максім працягвае навучанне ў Яраслаўскай гімназіі, дзе праяўляе сябе выдатным знаўцам літаратуры, які ведае на памяць вялікую колькасць вершаў, рыхтуе рэфераты на літаратурныя тэмы і выступае з імі перад навучэнцамі.

***«Кнігі М. Багдановіча»*** *(выступленне бібліятэкара)*

Першымі кнігамі, якія прачытаў Максім, былі «Роднае слова» і «Дзіцячы свет» выдатнага рускага педагога Ушынскага. У семнаццаць гадоў хлопец ужо піша вершы, якія сёння мы ўжо называем хрэстаматыйнымі. Усе, хто ведаў паэта, не праміналі кожны раз падкрэсліць, што гэта быў прыгожы юнак, высокі, з каштанавымі валасамі, з карымі вачыма, адухоўленым тварам. Максімам-кніжнікам называлі яго бацька і сябры-гімназісты. Кнігі ляжалі ў яго на стале, ён прыносіў іх з гімназічнай і ліцэйскай бібліятэк, ад знаёмых – адусюль, дзе толькі можна было іх дастаць. Вельмі любіў паэзію, музыку і народныя песні.

1907 г. лічыцца пачаткам літаратурнай дзейнасці Максіма Багдановіча. Яго першым значным мастацкім творам было беларускамоўнае празаічнае апавяданне «Музыка», якое адразу ж надрукавала «Наша ніва». У гэтым творы малады аўтар выказваў надзею на хуткія перамены ў лёсе Беларусі да лепшага.

У 1908 г. Максім Багдановіч напісаў першыя лірычныя вершы: «Над магілай», «Прыйдзе вясна», «На чужыне», якія былі апублікаваны ў «Нашай ніве». І, пачынаючы з 1909 г., творы Максіма Багдановіча не сыходзілі са старонак гэтай газеты.

*Вучань дэкламуе верш «Прыйдзе вясна».*

**Вядучы.** Для сям'і Багдановічаў вялікім выпрабаваннем было захворванне на туберкулёз, ад якога памерлі многія з родных. А вясной 1909 г. захварэў і Максім. Бацька адвозіць яго ў Крым на лячэнне. Максім захапіўся паўднёвым краем, у яго з'явілася новае кола знаёмых, тут хлопец закахаўся − усё гэта паўплывала на рамантычны настрой юнака. Здароўе яго паляпшаецца.

***«Малюем Багдановіча»*** *(выступленне вучня)*

Ужо ў 1909 г. убачылі свет вершы паэта з цыкла «У зачарованым царстве» («Вадзянік», «Лясун», «Змяіны цар», «Возера»). Калі іх чытаеш, перад табою

быццам паўстае хараство і таямніцы беларускай зямлі, старыя бары, цёмныя пушчы, населеныя лесунамі, вадзянікамі, русалкамі і іншымі міфічнымі істотамі. У вершах гэтага цыкла спалучыліся вобразы народнай фантазіі і паэтычныя ўяўленні М. Багдановіча, злілася душа паэта з царствам светлай прыроды. *(Вучань чытае верш «Возера».)*

Вершы, якія ўвайшлі ў гэты цыкл, прасякнутыя духам язычніцкіх павер'яў, складаюць асаблівую старонку ў беларускай лірыцы. Багдановічу ўдалося захаваць у гэтых творах непасрэднасць старажытнага светаўспрымання, тую першаснасць і свежасць паэтычнага бачання, якімі зачароўваюць нас міфалагічныя беларускія казкі і легенды, замовы і павер'і. Лесуны, вадзянікі і русалкі так арганічна ўведзены ў паэтычную фактуру вершаў, што зусім не псуюць хараства рэалістычных малюнкаў, а толькі надаюць ім адметны каларыт і дапамагаюць стварыць пэўны настрой. *(Вучань чытае вершы «Вадзянік» і «Змяіны цар».)*

**Вядучы.** 1911 г. стаў пераломным у жыцці Максіма Багдановіча. Ён закончыў гімназію. Хаця стан здароўя паэта ў гэты час быў не вельмі добры, ён вельмі хацеў вярнуцца на радзіму. Пасля заканчэння вучобы ён наведаў Вільню, дзе пазнаёміўся са славутымі дзеячамі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху: братамі Луцкевічамі, Вацлавам Ластоўскім і Б. І. Эпімах-Шыпілам. Багдановіч адкрыў для сябе Беларусь не толькі як край народнага гора, але і як краіну, якая нарадзіла Ф. Скарыну.

Псалтыр, пакрытую няжорсткай бурай кожай,
Я ўзяў і срэбныя засцёжкі адамкнуў,
Перачытаў радкі кірыліцы прыгожай
І воску з ладанам прыемны пах пачуў.

Пасля наведвання Віленскага прыватнага беларускага музея братоў Луцкевічаў малады паэт азнаёміўся з калекцыямі старажытных рарытэтаў – слуцкіх паясоў, розных па вырабе, арнаменце і афарбоўцы. Пад уражаннем ад іх прыгажосці ён напісаў верш «Слуцкія ткачыхі», у якім расказвае сумную гісторыю прыгонных ткачых, апісвае хараство роднай зямлі, паэтызуе ўмельства

ткаць залатыя паясы. І вось ужо, як тая рачная плынь Віліі, ля якой у задуменні прыпыніўся паэт, паліліся радкі…

*Песня «Слуцкія ткачыхі» на музыку У. Мулявіна у выкананні ВІА «Песняры».*

**Вядучы.** Па запрашэнні братоў Луцкевічаў Максім Багдановіч амаль усё лета 1911 года жыў у фальварку Ракуцёўшчына каля Маладзечна. Да гэтага часу ён меў толькі кніжнае ўяўленне аб Беларусі, але тут у 20-гадовым узросце змог зблізку ўбачыць беларускую прыроду, жыццё і побыт беларусаў (цяпер у Ракуцёўшчыне працуе філіял музея). Менавіта ў гэты час нарадзіўся цыкл вершаў «Старая Беларусь», які прысвечаны тэме любові да бацькаўшчыны. У вершах знайшлі сваё паэтычнае адлюстраванне здабыткі нацыянальнай культуры, старажытная гісторыя беларускага народа. Дарэчы, іменна ў Ракуцёўшчыне Багдановіч упершыню пабываў на беларускім вяселлі. Яго прыемна ўразіла багацце вясельна-абрадавай паэзіі, яе глыбокі нацыянальны каларыт.

*Дэманструецца відэаролік аб нацыянальных вясельных традыцыях «Ой, у лесе».*

**Вядучы.** Вярнуўшыся у 1911 г. з Беларусі ў Яраслаўль, Максім Багдановіч паступіў у Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй, навучанне ў якім завяршыў у 1916 г.

***«Перакладаем Багдановіча»*** *(выступленне вучня)*

Увесь час Максім вельмі настойліва займаўся самаадукацыяй. Сярод ліцэістаў вылучаўся начытанасцю, багатай эрудыцыяй. Яго веды ў галіне гісторыі, літаратуры, культуры народаў славянскага свету мелі энцыклапедычны характар. Шмат увагі ён аддаваў замежным мовам: вывучаў грэчаскую, лацінскую, італьянскую, польскую, французскую і нямецкую. І не пераставаў пісаць. *(Вучань чытае верш М. Багдановіча на замежнай мове.)*

***«Спяваем Багдановіча»*** *(выступленне настаўніка музыкі)*

Яраслаўскі перыяд жыцця Максіма Багдановіча – час напружанай і найбольш плённай творчай працы. У гэты час ён напісаў лепшыя свае творы, у тым ліку і вершаванае лірычнае апавяданне «Вераніка», дзе выразна праявілася захапленне

Максіма Багдановіча вобразам жанчыны, які стаў адным з цэнтральных у яго творчасці.

Калі ж я неяк з ёй спаткаўся,
Загаварыўшы, як у сне, –
Яна зірнула на мяне,
І раптам з вуст яе сарваўся
Такі бязвінны, чысты смех,
Што на яго злавацца – грэх.

У цыкле вершаў «Мадонны» Максім Багдановіч увасобіў сваё разуменне вобраза мадонны – ідэала высокай красы, жаноцкасці, хараства, дабрыні і чалавечнасці. Паэт знаходзіць рысы мадонны ў вобліку гераіні вершаванага апавядання «Вераніка». Хоць яно і мае эпіграф «Яна – выдумка маёй галавы», вядома, што яе радкі навеяны пачуццём закаханасці ў сястру свайго аднакласніка Ганну Какуеву, таленавітую піяністку. Фабула «Веранікі» – успамін аб дзяўчынцы, якая непрыкметна для аўтара, «ў красе свае вясны» вырасла, абудзіўшы ў душы паэта першае каханне, а з ім – цягу да ідэальнага, прыгожага, да паэзіі. Імя Вераніка стала ў беларускай літаратуры сімвалам чысціні і высокасці кахання.

*Гучыць песня «Вераніка» на музыку І. Лучанка ў выкананні ВІА «Песняры».*

**Вядучы.** Каханне – пачуццё бязмернай павагі да жанчыны, крыніца лепшых імкненняў паэта. У творах М. Багдановіча гэта пачуццё сагрэта асаблівай цеплынёй, шчырасцю. Яго вершы пра каханне сцвярджаюць ідэю вечнасці гэтага высокага чалавечага пачуцця, яго вялікую жыццёвую і стваральную сілу.

❒ ***Прэзентацыя «Каханне Максіма Багдановіча да Ганны Какуевай»*** *(выступленне вучня)*

Аднойчы ў доме сваіх сяброў-гімназістаў Мікалая і Рафаіла Какуевых Максім пазнаёміўся з іх сястрой Ганнай. Тая пара, калі паэт амаль штовечар праводзіў у доме Какуевых, была самай шчаслівай у яго жыцці. Дома ў Какуевых заўсёды былі госці, гучала музыка. Моладзь гуляла ў гарадкі, лапту ці гарэлкі ў двары, а па вечарах спявала, дэкламавала літаратурныя творы ці проста размаўляла ў садзе, на

верандзе альбо на сене ў адрыне. Юнак пачаў вельмі часта бываць у доме Какуевых, знайшоўшы там утульнасць, цеплыню, радасць, дружную кампанію равеснікаў і… каханне. Ганна была душой дома. Як і ўсе ў сям'і Какуевых, яна многа чытала на рускай, французскай, нямецкай мовах. Любіла ездзіць вярхом, вандраваць, іграць на піяніна. Стройная, з тонкім тварам, цёмнымі вачыма, прыгожымі валасамі і мілай усмешкай, яна зачаравала Максіма. Ён… Яна… Выпадковая сустрэча… Адчайнае каханне… Расстанне… Чаму дзяўчына не адказвала маладому паэту ўзаемнасцю? Магчыма, яна і не заўважала пачуццяў хлопца. Наўрад ці ён адкрыта прызнаўся Ганне ў сваіх пачуццях: быў надта сціплы. А яна, магчыма, не хацела звязваць свой лёс з паэтам. Хто ведае?.. У красавіку 1914 года Аня скончыла з залатым медалём Пецярбургскую кансерваторыю, а ў маі выйшла замуж за Івана Лілеева – аднакласніка Максіма. Гэтаму замужжу паспрыяла цётка Ганны, якая, зведаўшы пра хваробу паэта на сухоты, амаль сілаю выдала дхяўчыну замуж. Навіна балюча раніла Багдановіча.

Мне доўгае расстанне з Вамі
Чарней ад Вашых чорных кос.
Чаму ж нядобры час прынёс
Мне доўгае расстанне з Вамі?
Я пабляднеў ад горкіх слёз
І трыялет пачаў славамі:
Мне доўгае расстанне з Вамі
Чарней ад Вашых чорных кос.

У яго вершах і апавяданнях з'явіліся ініцыялы «А.Р.К.», імёны Анна, Ганна Рафаілаўна, а ў яго гераінях сталі яўна прачытвацца рысы Ані. Мяркуюць, яна натхніла яго на напісанне знакамітага раманса «Зорка Венера ўзышла над зямлёю...»

*Інсцэніроўка апошняй сустрэчы Максіма Багдановіча з Ганнай.*

**Вядучы.** Была цудоўная ноч. Апошняя ноч іх сустрэч. Максім з нецярпеннем, трывогай, хваляваннем чакаў Аню. Чамусьці яе не было. Хваляванне ўсё больш і больш з новай сілай ахоплівала яго.

**Максім.** Аня, нарэшце… Я так хваляваўся, што вы не прыдзеце!

**Аня.** Прабачце, я спазнілася. Вы доўга чакалі?

**Максім.** Ну, што вы, Анечка! Я гатовы чакаць вас усё жыццё, толькі скажыце!

**Аня.** Не трэба так гаварыць, Максім... Вы ж ведаеце, што гэта немагчыма. Не ў нашай з вамі волі змяніць лёс. Нам не суджана быць разам.

**Максім.** Аня, я ведаю, што Богам мне адмерана нядоўгае жыццё, але ўсё без астатку яно належыць ВАМ!..

**Аня.** Мы спазніліся, Максім… Настаў час нам расстацца… Але кожную ноч, гледзячы ў зорнае неба, успамінайце мяне, вашу Анечку Какуеву і шукайце зорку Венеру…

*Дэманструецца ўрывак з фільма-казкі «Пастух Янка» (1996/97 г.г., рэжысеры Ю. Цвяткоў, В. Вярбоўская), у якім гучыць песня «Зорка Венера ўзышла над зямлёю...».*

**Вядучы.** Пачуццё да Ганны было настолькі глыбокае, што, здавалася, яно засланяла перад паэтам увесь свет. Перад ім была адна Ганна – сёння, заўтра, учора. Маленькая, пухнаценькая, чорнавалосая, яна сядзіць, склаўшы рукі, на фотаздымку, што знаходзіцца зараз у Літаратурным музеі Багдановіча. Паэт не раз бачыў яго, калі бываў у Какуевых.

Як адзначалася вышэй, у Вільні ў 1914 годзе ў друкарні Марціна Кухты выдадзены адзіны прыжыццёвы зборнік твораў Максіма Багдановіча «Вянок» (на тытуле пазначаны 1913 г.) – споведзь яго душы. Калі ен быў надрукаваны, паэт адзін з асобнікаў падарыў свайму сябру Мікалаю Какуеву, зрабіўшы на ім дароўны надпіс. Як аказалася, выданне ўвесь час захоўвалася ў Ганны... Яе сын Мікалай перадаў кнігу на радзіму паэта, і сёння яна знаходзіцца ў аддзеле рэдкай кнігі Нацыянальнай бібліятэкі.

*Гучыць песня «Максім і Магдалена» на музыку У. Мулявіна ў выкананні ВІА «Песняры».*

**Вядучы.** У зборніку каля 100 вершаў, якія аб’яднаны па цыклах: «У зачарованым царстве», «Гукі Бацькаўшчыны», «Думы», «Вольныя думы»,

«Старая спадчына», «Мадонны». Кветкі, трапятліва сабраныя М. Багдановічам для «Вянка», не завялі, а, наадварот, вабяць, прыцягваюць да сябе ўсё больш чытачоў.

*Вучні дэкламуць вершы паэта.*

**Вядучы.** Максім Багдановіч – мастак яркага лірычнага даравання. Вершы Максіма Багдановіча здзіўляюць сваей маляўнічасцю, тонкасцю ў перадачы абрысаў і ліній, фарбаў і гукаў. Свае пачуцці ў вершах Багдановіч выказвае спакойна, стрымана. І таму можна меркаваць аб яго вялікай сыноўняй павазе і любові да роднай зямлі, да яе чароўнай красы. З вялікім майстэрствам напісаны верш «Па-над белым пухам вішань…». У ім паэт тонка перадае музыку сінякрылага матылька, які спявае гімн вясне.

*Гучыць песня «Па-над белым пухам вішань...» на музыку У. Мулявіна ў выкананні Жанэт.*

***«М. Багдановіч і руская літаратура»*** *(выступленне вучня)*

У 1909-1913 гг. Максім Багдановіч напісаў рукапісны зборнік паэзіі «Зеленя», куды ўключыў вершы на рускай мове і 19 перакладаў сваіх жа беларускіх вершаў на рускую мову. Зборнік прызначаўся для яго стрыечнай сястры Г. Гапановіч, меркаванне якой малады паэт вельмі цаніў. З рускіх паэтаў ён больш за ўсё захапляўся Пушкіным, Лерматавым, Цютчавым, Фетам, Блокам. Многія вершы гэтых паэтаў ён ведаў на памяць.

Багдановіч імкнуўся ўзбагаціць маладую беларускую літаратуру новымі формамі, ужо добра асвоенымі ў сусветнай літаратуры, і тым самым істотна пашырыць яе творчыя магчымасці, удасканаліць літаратурную мову. На практыцы даказаў, што і па-беларуску могуць быць напісаны рамансы, санеты, трыялеты, рандо, актавы.

*Дэкламацыя вершаў са зборніка «Зеленя».*

**Вядучы.** Паездка ў Крым (з 1914 і амаль да канца 1916 г.), дзе ён праходзіў паўторны курс лячэння, была адной з самых значных падзей асабістага жыцця Максіма Багдановіча. Там яго сустрэла і ўзаемнае каханне. Восенню 1916 г., скончыўшы ў Яраслаўлі юрыдычны ліцэй і атрымаўшы магчымасць самастойна,

без аглядкі на матэрыяльную падтрымку бацькі, вырашаць свой лёс, Багдановіч пакідае Яраслаўль і едзе ў Мінск.

❒ ***Прэзентацыя «Успаміны пра Багдановіча»*** *(выступленне вучня)*

У імкненні быць як мага бліжэй да Беларусі яго не спынілі ні хвароба, ні адарванасць ад родных, ні прыфрантавое становішча ў горадзе. Ён працаваў сакратаром харчовага камітэта мінскай губернскай управы, адначасова займаўся справамі бежанцаў у Беларускім таварыстве дапамогі, удзельнічаў у рабоце гурткоў моладзі. Багдановіч пасяліўся на адной кватэры з літаратарам Змітраком Бядулем, які пазней пакінуў шмат ўспамінаў пра паэта, пра тое, як той апантана працаваў, нягледзячы на стан здароўя, якое ўвесь час пагаршалася: «Другі і апошні раз Максім Багдановіч прыехаў у Беларусь незадоўга да сваёй смерці і за некалькі месяцаў да рэвалюцыі. З вакна вагона ён бачыў патокі бежанцаў – тысячы змучаных і спакутаваных людзей уцякалі ад вайны. Ён кінуў цягнік і шмат вёрстаў ішоў пехатой. Хворы і без таго, ён з’явіўся на кватэру зусім знясілены, задыхаўся, пляваўся згусткамі крыві. Мае сёстры даглядалі яго, але хворы быў прыдзірлівы, злосны. Быў гатовы рукапіс другой кнігі, але ён вырашыў: «Не, не цяпер, калі гіне Беларусь!..» – і схаваў яго у маленькі саквояж, з якім прыехаў. Ен адмаўляўся нават ад цукру (хіба можа ён есці цяпер, калі тысячы дзяцей гінуць на дарогах без кавалка хлеба!), але часам, стамляючыся ад страшэннага душэўнага напружання, быў мілы і паэтычны».

У Максіма Багдановіча было шмат творчых планаў, ён шмат працаваў, хацеў выдаць шэраг паэтычных зборнікаў («Маладзік», «Пярсцёнак», «Шыпшына», «Полынь-трава»), задумаў напісаць хрэстаматыю для пачатковай школы. Але хвароба, якая забрала яго маці і брата, падабралася і да Максіма. Паэт не здаваўся, шмат пісаў, але хвароба не адступала. Сябры сабралі грошы паслалі яго на лячэнне ў Ялту.

Сярод рэчаў, якімі даражыў Багдановіч, было маленькае люстэрка ў металічнай аправе, што засталося яму ў памяць ад маці. Перад ад’ездам сястра Бядулі нечакана выпусціла яго з рук… Люстэрка разбілася. Бледнасць заліла твар Багдановіча і ён прашаптаў: «Усё, цяпер усё…» Усе кінуліся яго супакойваць,

угаворваць і толькі на вакзале, расчулены цеплынёй праводзінаў, ён забыўся пра гэты выпадак.

У канцы лютага 1917 г. Максім Багдановіч пакінуў Мінск. Доўгая дарога да Ялты, пошукі і няўдалы для паспяховага лячэння выбар кватэры, адсутнасць блізкіх людзей яшчэ больш аслабілі Максіма. Намаганні па выпраўленні стану здароўя не дапамагалі, але нават у апошнія дні перад смерцю ён працягваў пісаць, дапрацоўваў вершы з «Вянка», складаў «Беларускі лемантар».

Пра што былі яго апошнія думкі? Магчыма, пра родных, сяброў, далёкую Радзіму і , канечне, пра ЯЕ…

*Вучні чытаюць верш Н. Гілевіча «Апошняе спатканне з Веранікай…» і верш М. Багдановіча «Аня».*

❒ ***Прэзентацыя «Смерць паэта»*** *(выступленне вучня)*

Блізілася трагічная развязка. Паэт пра гэта ведаў і яшчэ больш настойліва працаваў. А думкі і пачуцці, якімі ён жыў, так і прасіліся на паперу.

Ужо пара дадому збірацца, –
Вечар позны, а час не стаіць.
Ах, калі б ты магла здагадацца,
Як не хочацца мне ухадзіць!
Там, на вулцы, ні сівер, ні бура,
Там адно толькі – мрок, самата.
Але як я маркотна, панура
Да свайго пацягнуся кута.
Думкі нудныя зноў закружацца,
Сэрца чулае, зноў забаліць...
Ах, калі б ты магла здагадацца,
Як не хочацца мне ухадзіць!

Багдановіч паміраў мужна і з годнасцю: без нараканняў і скаргаў. На яго стале засталося неадпраўленае пісьмо да бацькі: «Добры дзень, стары верабей... Маладому вераб'ю дрэнна...» За свой нядоўгі век Багдановіч зведаў шмат гора і

пакутаў, цяжкіх душэўных мук. Аб смерці ён гаворыць у вершах проста і натуральна, як аб жыцці, аб каханні, без адчаю і жаху.

Ў краіне светлай, дзе я ўміраю,
У белым доме ля сіняй бухты,
Я не самотны, я кнігу маю
З друкарні пана Марціна Кухты.

У Ялце 25 мая 1917 г. на 25-м годзе жыцця ад сухотаў памёр малады паэт. Ён пакінуў нас маладым, але яго спадчына засталася людзям. Максім Багдановіч пахаваны на гарадскіх могілках у Ялце.

Ён марыў жыць сярод бяроз,
А над магілай – кіпарысы.
У смерці – крымскія абрысы.
Ён марыў жыць сярод бяроз,
Застылі ў смутку твару рысы.
Як жорстка насмяяўся лёс!
Ён марыў жыць сярод бяроз,
А над магілай – кіпарысы.

*Гучыць песня «Краю мой родны! Як выкляты Богам…» на музыку У. Мулявіна ў выкананні ВІА «Песняры».*

**Вядучы.** Максім Багдановіч пражыў вельмі кароткае, але надзвычай плённае ў творчых адносінах жыццё. Ён дасягнуў шырокага прызнання сучаснікаў і нашчадкаў. Імя Максіма Багдановіча стаіць побач з такімі класікамі беларускай і сусветнай літаратуры, як Янка Купала і Якуб Колас. Яго творчая спадчына – істотная частка духоўнай культуры беларускага народа. Імя паэта стала адным з самых дарагіх у нашай памяці, памяці ўдзячных нашчадкаў.

След, які пакінуў у беларускай літаратуры, культуры, – яркі, самабытны, арыгінальны. І няхай пройдуць гады і дзесяцігоддзі, зменяцца новыя пакаленні, але вечна, нязгасна і неўміруча будзе гарэць на небе ***зорка Максіма Багдановіча***.

**Літаратура**

1. **Зубараў, Л.І.** Максім Багдановіч / Л.І.Зубараў. – Мінск: Універсітэцкае, 1989.
2. **Кошчанка, У.** Максім Багдановіч у інтэрнэце / У.Кошчанка. – Мінск: Роднае слова, 8 / 2011. - С.13-16.
3. **Шаладонава, Ж.** Эстэтычнае вымярэнне ў паэзіі Максіма Багдановіча / Ж.Шаладонава. – Мінск: Роднае слова, 12 / 2002. – С.20-21.